# ЖЫЦЦЁВАЯ МУДРАСЦЬ НІНЫ КАРАЧ

З успамінаў Н.Р.Карач, аг. Пагранічны



***Н.Р.Карач.***

Вайна пачалася ў нядзелю, а першых нямецкіх салдатаў я ўбачыла каля чыгункі праз тыдзень, у суботу. А назаўтра праз Дзевяткі ехаў нямецкі абоз. У вясковых дварах гарэлі кастры і нямецкія салдаты гатавалі ежу, прымушалі хлопчыкаў-падлеткаў мыць калёсы ў іх вазах. Я сама бачыла ўсё гэта, бо хадзіла да свае цёткі.

Большасць вясковых і хутарскіх маладых мужчын і хлопцаў былі адпраўлены на чыгунку. І мой будучы муж Аляксандр Карач, таксама чыгуначнік, працаваў там. Калі ў акупацыю мы з ім пажаніліся, то і жылі ў будцы абходчыка.

Немцы забіралі моладзь ў Германію. Я таксама атрымала паперу, і нават у камендатуры ў Свіслачы пабывала. Я і сёння захоўваю тую паперу – як страшны напамінак пра той жудасны час. Аднак татку ўдалося адкупіць мяне: ён завёз у Свіслач вялікага парсюка, а стрыечны брат налавіў мяшок рыбы…

Муж маёй сястры, Станіслаў Адлер, быў добра знаёмы з партызанам Аляксеем Карпюком, які потым стаў пісьменнікам. Сястра расказвала, што аднойчы пайшла даіць карову і пачула шорах на гарышчы хлява. Аляксей паказаў знакам, каб яна маўчала, ні пра што не пыталася. Ён хаваўся на гарышчы і ноччу. А потым па вёсцы і хутарах панеслася чутка: партызаны падарвалі нямецкі паравоз! Гэта, казаў сястры муж, зрабіў Аляксей. А неўзабаве нямецкія салдаты, выстраіўшы мясцовых мужчын уздоўж чыгункі, высвятлялі, чыіх гэта рук справа. На шчасце, нейкім цудам усе засталіся ў жывых, хоць гумы паспытаў кожны.

Марыя Драпеза